**В. Шынкіна**

# ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ЗАКЛЮЧЭННЯ КРЭЎСКАЙ УНІІ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ І ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Крэўская унія – адна з самых вядомых падзей у гісторыі нашай краіны, а таму мае розныя інтэрпрэтацыі ў гістарыяграфіі.

Перад Ягайлам стаяў шэраг праблем, якія перашкаджалі яму ў самым пачатку кіравання:

- рэальную ўладу Ягайла меў толькі на тэрыторыі свайго бацькі Альгерда, ва ўсёй астатняй частцы княства кіраваў яго дзядзька Кейстут;
- таксама на вялікакняжацкі прастол прэтэндаваў старэйшы сын Альгерда – Андрэй Полацкі;
- у заходнерускіх княствах узмацнялася апазіцыя супраць умацавання ўлады вялікага князя і палітыкі цэнтралізацыі. Першым узначаліў гэты рух Андрэй Полацкі.

Безумоўна, ВКЛ мела магчымасць на саюз с Вялікім княствам Маскоўскім, але гэта перашкаджала імкненню літоўскага князя захаваць самастойнасць сваёй краіны. Таму шлюб з дачкой Дзмітрыя Данскога і ўсе дамоўленасці былі ануліраваны.

Крэўская унія была падпісана ў 1385 г. паміж вялікім князем літоўскім Ягайла і польскімі феадаламі. Літва стала каталіцкай дзяржавай, а Ягайла робіцца каралём польскім і вялікім князем літоўскім. У многіх крыніцах гэта падзея апісваецца як страта самастойнасці і незалежнасці княства, інкарпарацыя ВКЛ у склад Польшчы («Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2008 г.» Я. К. Новіка і І. Л. Качалава, 2009 г. і падручнік «Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.» Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля, 1998 г.

Але ж прадстаўлена іншая інтэрпрэтацыя, і шэраг гісторыкаў даказваюць зваротнае (Г.М. Сагановіч «Нарыс гісторыі Беларусі», 2001 г.; І. А. Юхо «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», 2000 г.). Яны лічылі, што ВКЛ, нягледзячы на акт Крэўскіх пагадненняў, здолела захаваць сябе як незалежную краіну.

Такім чынам, калі прасачыць, у які час былі напісаны кнігі, можна зрабіць вывад, што, па-першае, аўтары зведалі ўплыў кан’юнктуры свайго часу. Па-другое, прыхільнасць аўтараў да якой-небудзь канцэпцыі ці тэорыі (а чаму ж была падпісана Крэўская унія, ці была яна ўвогуле). Магчыма, што тыя, хто займаў хоць бы нейтральную пазіцыю, лічылі, што ВКЛ, нягледзячы на сціплы саюз с Польшчай, захавала сябе як самастойную дзяржаву. Астатнія ж, каму, мабыць, не спадабаўся такі ход Ягайлы, апісваюць усё так, нібыта ВКЛ было інкарпаравана Польшчай і страціла сваю незалежнасць.

Нягледзячы на тое, што акт Крэўскіх пагадненняў быў, па большай сваёй частцы, сфальсіфікаваным, як лічыў Я. Юхо, унія усё ж такі моцна дапамагла не толькі Польшчы, але і Вялікаму Княству Літоўскаму. Для Польшчы аб’яднанне з княствам было вельмі важным па некалькіх прычынах: не было нашчадкаў караля, акрамя 14-гадовай Ядвігі; з усіх бакоў атакавалі крыжакі і г.д. Для ВКЛ выгада была ў тым, што, нягледзячы на саюз з Польшчай, яно здолела захаваць сваю незалежнасць і самастойнасць і зрабіла себя яшчэ больш моцнай і аўтарытэтнай дзяржавай на міравой арэне.